ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (818) ● Чацвер, 17 чэрвеня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

АДНАДУШНАЕ АДАБРЭННЕ

Выбары ў Вярхоўныя Саветы саюзных рэспублік і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных — свята ўсяго савецкага народа. І для мяне гэта быў радасны, хвалюючы дзень. Знамянальна, што выбары праходзілі ў абстаноўцы ўсеагульнага ўздыму, выкліканага XXIV з'ездам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. З'езд пераканаўча паказаў усяму свету маналітнае адзінства партыйных радоў, высокую палітычную загартоўку партыі, яе глыбокі, прынцыповы, навуковы падыход да вынікаў дзейнасці, да выпрацоўкі планаў на будучае.

Удзельнічаючы ў выбарах, мы давалі наказ сваім выбраннікам: актыўна садзейнічаць паспяховаму выкананню новага пяцігадовага плана, ажыццяўленню рашэнняў партыі.

Кожны з нас усведамляе, што галасаваў не толькі за асобных людзей. Аб гэтым пераканаўча было сказана Генеральным сакратаром ЦК КПСС Л. І. Брэжневым у яго прамове на перадвыбарным сходзе выбаршчыкаў Бауманскай выбарчай акругі г. Масквы. На галасаванне фактычна была пастаўлена і палітычная платформа блоку камуністаў і беспартыйных. «У яе аснове ляжаць рашэнні XXIV з'езда партыі, з'езда, намеціўшага дакладны курс на далейшае ўмацаванне магутнасці нашай краіны, на павышэнне дабрабыту і культуры савецкага народа, на далейшае згуртаванне савецкага грамадства і развіццё сацыялістычнай дэмакратыі, на барацьбу за мір і міжнародную бяспеку».

І мы аднадушным галасаваннем адабраем лінію нашай партыі!

В. ЕЛІСЕЕНКА,
студэнт юрыдычнага факультэта.

※ МАЛАДЫЯ ВЫБАРШЧЫКІ.

У ПАРТКОМЕ

ДОЎГ ПРАПАГАНДЫСТАЎ

Адно з апошніх пасяджэнняў партыйнага камітэта было прысвечана пытанню прапаганды рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Са справаздачамі аб прапагандысцкай дзейнасці калектываў выступілі загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі В. І. Сцяпанаў і загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі І. М. Лушчыцкі.

Як адзначылі выступіўшыя кіраўнікі кафедр і члены парткома, ва ўсёй рабоце кафедры асобую ўвагу ўдзялілі глыбокаму вывучэнню і прапагандзе гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ. Выкладчыкі правялі са студэнтамі спецыяльныя лекцыйныя і семінарскія заняткі. Куратары сістэматычна выступаюць у групах. Матэрыялы з'ездаў шырока выкарыстоўваюцца пры чытанні іншых лекцый. У кабінетах арганізаваны вітрыны, выстаўкі матэрыялаў і дакументаў з'ездаў.

Большасць прафесараў, дацэнтаў і выкладчыкаў кафедр рэгулярна чытаюць лекцыі для працоўных Мінска і рэспублікі. Толькі па матэрыялах з'ездаў прачытана каля 300 лекцый, праведзены чатыры навукова-тэарэтычныя канферэнцыі.

Разам з тым у рабоце кафедр ёсць і недахопы. Некаторыя выкладчыкі не заўсёды выкарыстоўваюць дакументы і матэрыялы з'ездаў на семінарскіх занятках. Не ўсе выкладчыкі ў працэсе выкладання курсаў прымяняюць тэхнічныя сродкі, нагляднасць.

Цяжка бывае атрымаць у бібліятэцы з'ездаўскія матэрыялы для кабінетаў. Нясвоечасова паступаюць сюды газеты, часопісы, патрэбная літаратура. Вострая патрэба адчуваецца ў даведніцкіх выданнях.

У пастанове партыйнага камітэта падкрэсліў галоўную задачу кафедр—павышэнне ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню лекцый, семінарскіх заняткаў. З гэтай мэтай прапанавана шырэй выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі і экскурсіі ў працэсе вывучэння матэрыялаў XXIV з'езда КПСС, забяспечыць павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў, узмацніць метадычную работу.

Загадчыкі кафедр павінны забяспечыць рэгулярны ўдзел усіх выкладчыкаў у лекцыйнай і прапагандысцкай рабоце сярод насельніцтва рэспублікі па матэрыялах XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда Кампартыі Беларусі.

Дырэктару бібліятэкі т. Арэхоўскай прапанавана забяспечыць своечасовае паступленне ў кабінеты неабходнай літаратуры, газет і часопісаў.



Уступныя экзамены на юрыдычнае аддзяленне завочнага факультэта.

На здымку: добра адказвае на пытанні па гісторыі СССР сержант БВА Леанід **Сапранецкі.**

Фота **Д. Чаховіча.**

ІХ АГУЛЬНЫ КЛОПАТ

НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

ЗА АПОШНЯЕ дзесяцігоддзе ў навукова-даследчай рабоце кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў вызначылася некалькі галоўных кірункаў. Гэта—распрацоўка пытанняў знешнепалітычнай дзейнасці партыі, гісторыя падрыхтоўкі і правядзення Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі, барацьба партыі супраць апартунізму і рэвізіянізму, дзейнасць КПБ у перыяд сацыялістычнага будаўніцтва і інш. Асаблівую ўвагу члены кафедры ўдзяляюць распрацоўцы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі.

За апошнія гады выдадзена вялікая колькасць манаграфічных даследаванняў, брашур, артыкулаў, у якіх з марксісцка-ленінскіх пазіцый асветлен увесь гераічны шлях камуністаў Беларусі ў адзіных радах ленінскай партыі.

У 1970 г. супрацоўнікі кафедры апублікавалі 17 навуковых работ агульным аб'ёмам у 84 друкаваныя аркушы. У часопісах і навуковых зборніках надрукавана 13 артыкулаў. У ленінскім юбілейным годзе кафедра была ўдзельніцай ВДНГ у Маскве і ўзнагароджана бронзавым медалем.

Цяпер гэта дружны, творчы калектыў. Асабістая адказнасць, высокая патрабавальнасць да сябе і да іншых, творчая дысцыплінаванасць — вось, бадай, самыя адметныя рысы кожнага супрацоўніка кафедры. У вышэйшай меры гэтыя якасці належаць кіраўніку калектыву доктару гістарычных навук прафесару Усеваладу Міхайлавічу Сікорскаму. Хоць напружаная дзейнасць членаў кафедры відавочная, але яны гавораць, што з Усеваладам Міхайлавічам працаваць надзвычай лёгка.

— Ён не толькі наш кіраўнік—ён лідэр: служыць прыкладам і ў навуковай, і ў лектарскай рабоце, карыстаецца аўтарытэтам за глыбокія веды і высокія чалавечыя якасці. Сваёй працавітасцю, жывой цікавасцю да навукі ўмее прыцягнуць увесь калектыў да агульнай справы.

Калектыўнасць тут—пераважны метад работы. Яна ў значнай меры спрыяе выпрацоўцы дысцыплінаванасці, пачуцця адказнасці агульнай і асабістай. З гэтай прычыны ўсё часцей практыкуюцца калектыўныя навуковыя выданні. Так, нядаўна супрацоўнікі кафедры прынялі актыўны ўдзел у напісанні першага ў рэспубліцы вучэбнага дапаможніка «Курс лекцый па гісторыі КПСС» у 2-х тамах.

Вялікую дапамогу аказвае кафедра вну рэспублікі ў абмеркаванні кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Наогул жа падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі — адна з важнейшых задач гэтага калектыву. Безумоўна, тут ёсць у каго павучыцца моладзі. Але прафесары У. М. Сікорскі, А. Я. Жураў, М. Я. Шкляр, І. М. Ігнаценка, кандыдаты гістарычных навук З. Г. Грыгор'ева, А. М. Малашка, І. О. Царук, А. А. Волк, Т. Я. Дударава і іншыя не толькі падаюць асабісты прыклад моладзі. Яны пастаянна кантралююць работу аспірантаў, асістэнтаў. Мабыць, з гэтай прычыны ўсе аспіранты кафедры своечасова абараняюць кандыдацкія дысертацыі, а многія і датэрмінова.

Узаемнае наведванне лекцый, а потым дзелавое абмеркаванне іх з прынцыповай крытыкай недахопаў на пасяджэнні кафедры стала звычаем. Гэта таксама дысцыплінуе супрацоўнікаў, прымушае да кожнай лекцыі або семінарскіх заняткаў рыхтавацца сур'ёзна, глыбока вывучаць навейшыя дакументальныя крыніцы. Можа таму вялікай папулярнасцю карыстаюцца лекцыі супрацоўнікаў гэтай кафедры. А экзамен па гісторыі КПСС пераважная большасць студэнтаў гуманітарных факультэтаў здае на добра і выдатна. Па словах прафесара А. Я. Журава, супрацоўнікі кафедры імкнуцца на семінарскіх занятках, на лекцыях і ў час экзаменаў выхоўваць не толькі спецыялістаў-гісторыкаў, але і грамадскіх дзеячоў, пашыраць дыяпазон іх інтарэсаў, правільна, па партыйнаму разумець складаныя пытанні сучаснасці і ўмець іх даступна тлумачыць.

Сведчаннем таго, што студэнцкая моладзь праяўляе жывую цікавасць да прадмета, можа паслужыць наступны факт. Пры кафедры працуе навукова-даследчы гурток. У мінулым навучальным годзе яго наведвалі 140 студэнтаў I—V курсаў гуманітарных факультэтаў. Да студэнцкай навуковай канферэнцыі (1970) яны падрыхтавалі 65 дакладаў; 40 студэнцкіх работ былі рэкамендаваны на рэспубліканскі конкурс і 19 з іх аднесены да I катэгорыі, 12—да II, 8—да III. Шэсць навуковых дакладаў адзначаны на Усесаюзным конкурсе.

Па ініцыятыве кафедры на гістарычным факультэце створана школа лектараў, у якую ўваходзяць студэнты старшых курсаў. Яны пастаянна выступаюць з лекцыямі на прадпрыемствах Мінска, выязджаюць разам з выкладчыкамі ў іншыя гарады і рэспублікі.

Без грамадскай дзейнасці вельмі цяжка ўявіць сабе работу кафедры. Кожны супрацоўнік яе мае некалькі грамадскіх даручэнняў. Цесная сувязь з партыйным камітэтам БДУ, з грамадскімі арганізацыямі горада, з таварыствам «Веды» спрыяе ўмацаванню больш цесных сувязей са шматлікімі працоўнымі калектывамі.

400 — гэта сціплы падлік лекцый, якія ў сярэднім прачытваюць супрацоўнікі кафедры за год. І не толькі перад працоўнымі нашай краіны выступаюць вучоныя БДУ. У навучальных установах Балгарыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Фінляндыі і іншых краін з захапленнем слухалі лекцыі прафесараў У. М. Сікорскага, А. Я. Журава, І. М. Ігнаценкі.

А некалькі тыдняў назад У. М. Сікорскі вярнуўся з цікавай паездкі па Італіі, дзе чытаў лекцыі аб XXIV з'ездзе КПСС.

Клопаты, клопаты... Іх шмат у кожнага супрацоўніка кафедры. Усевалад Міхайлавіч цяпер занят падрыхтоўкай да прыёму вучоных Іенскага універсітэта, разам з якімі калектыў кафедры да 50-годдзя універсітэта рыхтуе зборнік артыкулаў па пытаннях крытыкі буржуазнай ідэалогіі. Ён будзе рэдагаваць рускую частку. Дацэнты Д. П. Жмуроўскі і А. М. Малашка рыхтуюць да абароны доктарскія дысертацыі. Хапае цяпер клопатаў і ў выкладчыкаў, аспірантаў, асістэнтаў: ідуць уступныя экзамены на завочным факультэце. Л. П. Максімава і П. Г. Чыгрынаў толькі што абаранілі кандыдацкія дысертацыі. П. І. Бондар — загадчык кабінета—занят клопатамі аб набыцці новай апаратуры, папаўняе фанатэку кафедры запісамі лепшых лекцый, стварае выключна сістэматызаваную картатэку. Хоць кожны член калектыву занят сваёй асобнай справай, іх агульная дзейнасць падпарадкавана адной мэце — мэце выхавання высокаадукаванага чалавека.

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

З БАЦЬКОЎСКІМ КЛОПАТАМ

Гады, пражытыя чалавекам, — гэта пройдзены шлях, вопыт, веды, барацьба, паражэнні і перамогі. Гэта яго гісторыя, біяграфія. Гэта маральны капітал, набыты жыццём.

Пётр Захаравіч Савачкін — чалавек таго пакалення, якому выпала цяжкае і разам з тым яркае жыццё. Выхадзец з сялян, Пётр Захаравіч пераняў іх вялікую працавітасць, жыццёвую сілу і любоў да людзей працы. Ён рос і фарміраваўся як чалавек і грамадзянін у знамянальны час, калі ўсё было першым: першая ў свеце пераможная сацыялістычная рэвалюцыя, першая дзяржава рабочых і сялян, першыя пяцігодкі, першыя атрады новай, савецкай інтэлігенцыі. Дастойным прадстаўніком гэтай інтэлігенцыі з'яўляецца і сам Пётр Захаравіч. 40 год ён працуе на ніве асветы і навукі.

Пётр Захаравіч Савачкін пачаў свой працоўны шлях школьным настаўнікам у 1931 г. пасля заканчэння педагагічнага вучылішча. Яго педагагічны і арганізатарскі талент праявіўся ўжо тады не толькі на выкладчыцкай працы, але і на пасту дырэктара школы ў вёсцы Літвінавічы Ветрынскага раёна. Камсамолец 20-х гадоў, як і ўсё арлінае племя Краіны Саветаў, ён заўсёды быў на грэбені грамадскай хвалі: ці ішла ліквідацыя непісьменнасці, ці ствараліся калгасы, ці праводзіліся іншыя важныя дзяржаўныя і палітычныя кампаніі.

Прага да новых ведаў і сам час, гераічны і імклівы, прывядзяць Пятра Захаравіча ў Белдзяржуніверсітэт. У 1935 годзе ён становіцца студэнтам гістарычнага факультэта, праз год пасля яго арганізацыі, і працуе тут па сённяшні дзень. Выдатны студэнт, добры актывіст і таварыш — такім быў Пётр Захаравіч у гады вучобы. Універсітэт ён закончыў на выдатна. Вялікі ўплыў на фарміраванне Пятра Захаравіча як гісторыка аказалі нашы выдатныя вучоныя М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, Д. А. Дубкоў, Л. М. Шнеерсон, Г. М. Ліўшыц.

Нядоўга прыйшлося папрацаваць маладому гісторыку — пачалася Вялікая Айчынная вайна. З першых і да апошніх яе дзён Пётр Захаравіч у радах гераічных абаронцаў Айчыны. Ён перажыў вайну ад горкіх дзён адступлення да штурму Берліна. Яго ратныя подзвігі адзначаны высокімі ўзнагародамі.

Скончылася вайна, і Пётр Захаравіч зноў у родным універсітэце. Ён — аспірант кафедры гісторыі СССР. З 1949 года — старшы выкладчык, з 1955 — дацэнт гэтай жа кафедры. Гэтаму папярэднічала паспяховая абарона кандыдацкай дысертацыі па вялікай і актуальнай праблеме.

Пётр Захаравіч — чалавек, які ў адной асобе шчасліва спалучае каштоўныя якасці таленавітага лектара, умелага арганізатара, сур'ёзнага вучонага, удумлівага педагога, душэўнага выхавацеля. Шырокае кола навуковых інтарэсаў Пятра Захаравіча. Ён займаецца вывучэннем гісторыі БССР і СССР савецкага перыяду. Прыцягвае яго ўвагу як даследчыка і развіццё беларуска-балгарскай дружбы. Асабліва трэба падкрэсліць вялікую заслугу яго ў стварэнні вучэбных і метадычных дапаможнікаў для студэнтаў. Ён здзяйсняе навуковае рэдагаванне зборнікаў навуковых работ, вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Пяру Пятра Захаравіча належыць больш 40 навуковых работ.

П. З. Савачкін неаднаразова прадстаўляў беларускую гістарычную навуку на кангрэсах, сімпозіумах, канферэнцыях гісторыкаў — рэспубліканскіх, саюзных, міжнародных. Ён унёс сваю даніну ў стварэнне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Вось ужо 15 год, як Пётр Захаравіч Савачкін узначальвае гістарычны факультэт. Глыбокае разуменне задач, якія стаяць перад вышэйшай школай на сучасным этапе развіцця нашага грамадства, шырокая эрудыцыя, партыйная прынцыповасць, вялікі талент, асабістая прывабнасць дапамаглі яму згуртаваць калектыў гістфака і стварыць атмасферу пастаяннага творчага пошуку, узаемнай патрабавальнасці і добразычлівасці.

Гістарычны факультэт займае адно з вядучых месц ва універсітэце па арганізацыі вучэбнага працэсу, па паспяховасці студэнтаў, удзелу ў грамадскім жыцці, па пастаноўцы навукова-даследчай работы. За 15 год гістфак выпусціў звыш 2-х тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, з якіх больш 200 сталі кандыдатамі навук. Выпускнікі гістфака паспяхова працуюць у школах і інстытутах, ва універсітэце і Акадэміі навук, у партыйных і савецкіх органах. І ўсе яны з удзячнасцю ўспамінаюць бацькоўскую клапатлівасць, чулую ўвагу да іх дэкана факультэта.

Пятру Захаравічу споўнілася шэсцьдзесят год. Гэта вялікая вяха ў жыцці чалавека. Вяха, але не рубеж. 60—гэта сталасць, мудрасць, майстэрства, размах. Гэта пара жніва, збору ўраджаю. Напярадзе яшчэ так многа працы, і гэта цудоўна.

Горача віншуючы Пятра Захаравіча са слаўным юбілеем, мы жадаем яму моцнага здароўя на доўгія гады, шчасця і здароўя яго сям'і, новых духоўных радасцей і дасягненняў.

М. БАРАНАВА,
дацэнт.

АПОШНІЯ СТАРОНКІ ДЗЁННІКА

БДУ — ІМЯ ГАНАРОВАЕ



(Заканчэнне. Гл. №№ 20, 21. 22).

(РЭЧЫЦА — СВЕТЛАГОРСК)

Цёплы вечар. У цёмна-блакітным чыстым небе вось-вось замігаюць зоркі. Пройдуць па рацэ апошнія цеплаходы, засне вецер у сасняку і ляжа на зямлю густая цішыня...

Любуюся Дняпром. Берагі тут крутыя, з залатымі пражылкамі пяску. Над самай вадой схіляюцца вербы.

Ледзь-ледзь віднеецца процілеглы бераг. Справа рака ўліваецца шырокім, як неба, патокам. Зялёны востраў разразае яе на два рукавы. І цячэ Днепр далей, ахопліваючы вялізную прастору. Успамінаюцца словы Аляксея Максімавіча Горкага. Праўда, сказаны яны пра Волгу: «Глядзіш на раку і не разумееш: ці яна табе ў грудзі плыве, ці сама з тваіх грудзей цячэ»...

Які цудоўны, казачна прыгожы, багаты і прасторны край, мая ты Беларусь!

Ужо зусім цёмна. Ствалы дрэў зліваюцца з густым змрокам. Здалёк віднеецца касцёр. Яркі, з цэлым снапом іскраў. Сёння я свой дзённік буду дапісваць пры яго святле...

Звініць гітара, і маладыя галасы пяюць пра Бетховенскія санаты, Салавецкія астравы і вечар, «што ціха крочыць па начных сцяжынках». Пяюць пра маладосць сваю і шчаслівыя гады студэнцтва, пра дальнія дарогі і агонь, што «б'ецца ў цеснай пячурцы»...

Задумаўся аб нечым сваім Валодзя Белакосаў, наш камандзір. Відаць, успамінаюцца яму іншыя паходы, дзе былі сапраўдныя цяжкасці, сапраўдныя выпрабаванні сіл, настойлівасці, мужнасці. Забайкалле... Поўнач... Шушанскае... Тысячы і тысячы кіламетраў.

Кабінеты і ўтульныя кватэры існуюць не для такіх людзей. Дарогі, новыя мясціны, новыя людзі і сустрэчы—іх жыццё, іх адпачынак.

Не шукае ўтульнасці і Вера Прокашава, чалавек, якому ёсць аб чым расказаць. Яна крочыла па гарачай Даліне гейзераў, бачыла, як выкідваў вулкан у Дагестане вогненную лаву, узыходзіла на завоблачныя вяршыні Паміра.

З якімі толькі людзьмі не зводзіў яе лёс! З цудоўнымі бадзягамі, фанатыкамі, фантазёрамі-летуценнікамі. З сапраўднымі сябрамі, надзейнасць якіх правярала жыццё ў самыя цяжкія моманты.

Задумаўся і наш Міхаіл Міхайлавіч. Можа, песні нашы і касцёр напомнілі яму франтавое юнацтва?

Песня будзіць чалавечыя пачуцці, будзіць у душы добрае, чыстае, светлае... І бліжэй становяцца людзі, іх інтарэсы, думкі. І будзеш сустракацца потым з імі як з самымі добрымі сябрамі. Такімі сябрамі застануцца і Пётр Лаўрэнцьевіч Салаў з яго цудоўнай усмешкай і шчырай, цёплай прастатой, і Вася Кушнер, наш баявы камісар, і вадзіцелі матацыклаў Валерый Емяльянаў, Георгій Кішкурна, Міхаіл Урбан ды і ўсе іншыя ўдзельнікі агітпрабегу «БДУ-50».

Цудоўныя, цікавыя, розныя і такія падобныя людзі. Падобныя цягай да падарожжа, да новага, невядомага...

Мы развіталіся з горадам нафтавікоў Рэчыцай, з саўгасам «Падалессе», з цудоўным чалавекам — настаўнікам геаграфіі Аляксандрам Георгіевічам Дубровіным, стварыўшым музей, слава аб якім вядома далёка за межамі рэспублікі.

Пабывалі ў Светлагорску, сапраўды светлым і юным горадзе на Бярэзіне, дзе працавалі мы шмат і з натхненнем. Апошнія выступленні, апошнія сустрэчы. Апошнія запісы ў дзённіку...

Вось і закончыўся наш маршрут.

Мы выцягалі жывую кнігу аб роднай Беларусі, адчулі яе працоўны пульс, сустрэліся з людзьмі розных пакаленняў. Мы ўпэўніліся, з якой павагай адносяцца людзі да Беларускага дзяржаўнага універсітэта, як радуюцца дасягненням і шчыра вітаюць са святам старэйшую вышэйшую навучальную установу рэспублікі, якая носіць імя Уладзіміра Ільіча Леніна.

Л. ЕКЕЛЬ.



НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) аб тым, як здабываецца беларуская нафта, расказвае інжынер Б. Д. Пятроў; (унізе) над дняпроўскімі прасторамі.
Фота В. ЖУКА.



На здымках: (злева) вучэбная гаспадарка Шчомысліца. Студэнты біялагічнага факультэта В. Дабрыян, А. Дзямідава, З. Пішчык і З. Саўчык збіраюць насенне для універсітэцкага батанічнага сада; (справа) рыхтуюцца да экзаменаў студэнты-географы.

Фота **Д. Чаховіча.**

✻ Як лепш наладзіць культурна-масавую работу ў студэнцкіх атрадах, арганізаваць спартыўныя мерапрыемствы, выпускаць насценныя газеты? Рашэнню гэтых пытанняў была прысвечана нарада камандзіраў і камісараў Барысаўскай зоны. НА ЗДЫМКУ: свае прапановы ўносіць камандзір Барысаўскага штаба СБА, камісар штаба працоўных спраў універсітэта У. РАСОХІН.

✻ Для бібліятэчкі студэнцкага будаўнічага атрада «Буравеснік» філалагічнага факультэта сабрана шмат кніг. НА ЗДЫМКУ: камандзір атрада В. АДАМУШКА і камісар М. РАМАНАЎ прымаюць новыя кнігі. Фота В. ЖУКА.

У АДЗІНАЙ СТУДЭНЦКАЙ СЯМ'І

У СТУДЭНЦКАЙ сям'і нашага універсітэта не цяжка знайсці прадстаўнікоў самых розных краін і народаў. І калі на падрыхтоўчым факультэце вы можаце пазнаёміцца з в'етнамскімі студэнтамі, то на асноўных — фізічным, матэматычным, прыкладной матэматыкі, хімічным, філалагічным — вашымі знаёмымі і сябрамі могуць стаць балгары і французы, румыны і венгры, юпакі і дзяўчаты з Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і Рэспублікі Паўднёвы В'етнам, прадстаўнікі Афганістана, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Лівана, Ганы, Камеруна, Самалі і іншых краін.

З першага і да апошняга курса яны жывуць адзіным жыццём з савецкімі студэнтамі і не толькі добра вучацца, а і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскіх справах, выступаюць на навуковых канферэнцыях, у канцэртах мастацкай самадзейнасці.

У гэтым навучальным годзе ў нашым універсітэце займаецца 206 замежных студэнтаў, 15 аспірантаў і 9 стажораў.

У зімовую экзаменацыйную сесію пераважная большасць замежных студэнтаў паказала добрыя веды. Паспяхова авалодвалі яны і грамадскімі навукамі. Так, сярэдні бал па гісторыі КПСС быў 4,7, па марксісцка - ленінскай філасофіі — 4,5, па палітэканоміі — 4,2.

Вялікую зацікаўленасць да грамадскіх дысцыплін праяўляюць Самір Шахін (Судан), Жак Амідзі (Ліван), Нгуен Фыонг Лан, Ле Конг Кві, Чан Хыу Фук (ДРВ) і многія іншыя. Яны глыбока вывучаюць творы класікаў марксізму - ленінізму і актыўна выступаюць на семінарах, рыхтуюць навуковыя даклады, з якімі выступаюць на канферэнцыях. Высока былі ацэнены работы «У. І. Ленін і наш час» Ж. Амідзі, «У. І. Ленін і рэвалюцыя ў В'етнаме» аспіранта Нгуен Ван Тхоа, «У. І. Ленін аб ролі народных мас у працэсе гістарычнага развіцця» Мухамеда Якуба Амоні (Афганістан) і шмат іншых.

На Усесаюзнай канферэнцыі ў Казані, прысвечанай ленінскаму юбілею, даклады Ж. Амідзі, Р. Кейге, Нгуен Ван Тхоа і аспіранта Джона Флетчара былі ўдастоены дыпломаў II і III ступені. А Джон Флетчар за працу «Асвета ў краінах Афрыкі» заваяваў першае месца на Усесаюзным семінары па праблемах Афрыкі.

У красавіку гэтага года студэнт II курса юрфака Самір Шахін з дакладам «Дэмакратычная рэвалюцыя — шлях да барацьбы за свабоду маладых развіваючыхся краін Афрыкі» выступіў на V Усесаюзнай інтэрнацыянальнай студэнцкай канферэнцыі ў Маскве.

Гэтым поспехам папярэднічала вялікая работа калектыву дэканата па навучанню іншаземных грамадзян. У сваёй працы па развіццю грамадска - палітычнай актыўнасці замежных студэнтаў ён абапіраецца на дэканаты факультэтаў, кафедры грамадскіх дысцыплін, камсамольскую і прафсаюзную арганізацыі універсітэта.

З замежнымі студэнтамі працуюць вопытныя выкладчыкі, камуністы Э. М. Шпілеўскі (фізфак), А. А. Бурдун (матфак). Кафедры грамадскіх навук прызначылі адказных за работу з замежнымі студэнтамі. Гэта дацэнт кафедры гісторыі КПСС К. К. Герман (ён жа дэкан), ст. выкладчык кафедры палітэканоміі Э. В. Шастаковіч, выкладчык кафедры марксісцка - ленінскай філасофіі, Герой Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў.

Плануючы работу, дэканат і кафедры грамадскіх навук заўсёды накіроўваюць увагу на актуальныя і дзейсныя мерапрыемствы. Так, замежныя студэнты былі слухачамі цыклу лекцый «Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна». Цыкл лекцый і цікавыя сустрэчы прысвячаліся 150-годдзю з дня нараджэння Ф. Энгельса. Прафесар М. С. Малінін расказаў студэнтам аб вынніках і перспектывах эканамічнага развіцця Беларусі, а прафесар А. Я. Жураў — аб барацьбе КПСС за ўмацаванне садружнасці еўрапейскіх сацыялістычных краін.

Нашы сябры пазнаёміліся з Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС і іншымі матэрыяламі з'езда і з гісторыяй БДУ, які рыхтуецца адзначыць 50-гадовы юбілей.

Вельмі цікава і карысна праходзяць сустрэчы, якія арганізуе дэканат, з кіраўнікамі факультэтаў і партыйнымі бюро. У час такіх сустрэч на фізічным і матэматычным факультэтах студэнты-іншаземцы пазнаёміліся з вучэбнай работай, навуковымі праблемамі, якімі займаюцца вучоныя факультэтаў, з работай партыйных арганізацый.

Традыцыйнымі сталі ва універсітэце выступленні замежных навучэнцаў перад савецкімі студэнтамі. На фізічным, геаграфічным, матэматычным, біялагічным факультэтах яны расказвалі аб грамадска-палітычным развіцці сваіх краін, гістарычным шляху і маладзёжным руху ў Афрыцы і на Арабскім Усходзе.

Жаданыя госці нашы замежныя студэнты і ў іншых вну, на прадпрыемствах, у дзіцячых садах і дамах піянераў. Паказальнай з'яўляецца паўнакроўная дружба замежных студэнтаў з калектывам Мінскага камвольнага камбіната, якая развіваецца, дзякуючы моцным, пастаянным сувязям арганізацыі Саюза працоўнай моладзі Хо Шы Міна з камітэтам камсамола камбіната. Яскравым яе адлюстраваннем стаў тыдзень савецка-в'етнамскай дружбы, праграма якога была насычана цікавымі і карыснымі справамі. Незабыўныя ўражанні пакінулі ў моладзі сустрэчы з кіраўнікамі камбіната, ветэранамі партыі, героямі вайны і працы.

Вялікай цеплынёй і сардэчнасцю бываюць прасякнуты гутаркі з піянерамі і камсамольцамі школ Мінска і рэспублікі. А такія гутаркі асабліва частыя, калі адпраўляецца ў падарожжа летні аўтапоезд «Дружба».

Многія замежныя студэнты з'яўляюцца ганаровымі членамі маладзёжных клубаў «Данка», «Равеснік», «Мара». Актывісты інтэрнацыянальнага сектара камітэта камсамола БДУ часта выступаюць па радыё, тэлебачанню, у прэсе. З цікавасцю чытае моладзь цэнтральныя і рэспубліканскія газеты і часопісы. А вольны час многія аддаюць мастацкай самадзейнасці.

У інструментальным ансамблі фізічнага факультэта, у групе салістаў, у хоры, які налічвае 60 чалавек, у танцавальным калектыве юнакі і дзяўчаты ўдасканальваюць майстэрства, знаёмяцца з творамі рускіх і беларускіх кампазітараў, з багаццямі нашага нацыянальнага мастацтва. І, як правіла, на святочных урачыстасцях ва універсітэце, у саставе студэнцкіх канцэртных брыгад са сваімі праграмамі выступаюць замежныя студэнты.

Каля 100 іншаземцаў займаюцца ў шматлікіх спартыўных секцыях, удзельнічаюць у факультэцкіх і міжвузаўскіх спаборніцтвах. З вялікім задавальненнем наша студэнцтва ўспрыняла поспех Нгуен Нгок Кхуэ, які заняў III месца ў асабістакамандным першынстве студэнтаў вну рэспублікі па класічнай барацьбе.

Некаторыя студэнты з'яўляюцца членамі гарадскіх клубаў і студый. Радаснай для ўсіх была вестка аб тым, што Во Чунг Цяу атрымаў дыплом пераможцы ў рэспубліканскім конкурсе карцін самадзейных мастакоў і майстроў прыкладнога мастацтва. Гэты студэнт — адзін з актыўных членаў мастацкай студыі Палаца культуры прафсаюзаў.

Палітычная актыўнасць навучэнцаў загартоўваецца дзякуючы іх удзелу у студэнцкіх грамадскіх арганізацыях: камсамольскай —праз інтэрсектар, савеце інтэрната, савеце дружбы. Апошні, напрыклад, рэгулярна выпускае насценгазету «Дружба народаў», разам са студсаветам арганізуе сустрэчы з вучонымі, «агеньчыкі». Ён з'яўляецца ініцыятарам у правядзенні камуністычных суботнікаў іншаземных навучэнцаў. У гэтым годзе вялікі інтэрнацыянальны студэнцкі атрад прыме ўдзел ва ўдарным працоўным семестры ў гонар 50-годдзя БДУ.

Добрая паспяховасць, высокая грамадская актыўнасць, атмасфера сяброўскай узаемадапамогі савецкіх і замежных студэнтаў сведчаць аб тым, што наш універсітэт свята выконвае свой інтэрнацыянальны доўг. Аб гэтым яскрава гавораць і шматлікія пісьмы, поўныя глыбокай павагі і сардэчнай падзякі, якія штогод прыходзяць з розных краін свету ў дэканат ад выхаванцаў БДУ.

Л. ГАЎРЫЛАВА.

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

Канцэртная зала Палаца культуры прафсаюзаў на гэты раз была прадастаўлена для правядзення агляду мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў, якія вучацца ў Мінску. Гэтыя агляды сталі ўжо традыцыйнымі, і кожны з іх з'яўляецца для замежных навучэнцаў свайго роду творчай справаздачай. Самадзейныя артысты не толькі знаёмяць гледачоў з культурай і мастацтвам сваіх краін, але і дэманструюць поспехі ў засваенні культуры Савецкай Краіны, у якой вучацца.

Да сёлетняга агляду студэнты-іншаземцы, якія вучацца ў нашым універсітэце, у політэхнічным інстытуце і іншых навучальных установах Мінска, падрыхтавалі цікавую і змястоўную праграму. Асноўнае месца ў ёй заняло выступленне в'етнамскіх студэнтаў. У канцэрце прынялі таксама ўдзел студэнты з афрыканскіх краін, Балгарыі, Лівана.

З вялікай праграмай выступілі студэнты БДУ. Гледачы цёпла сустрэлі харавы калектыў падрыхтоўчага факультэта. У яго рэпертуары песні аб Леніне, аб Расіі. З глыбокім пачуццём в'етнамскія студэнты выканалі песню «З чаго пачынаецца Радзіма». Аб барацьбе народа В'етнама за свабоду расказала харэаграфічная кампазіцыя танцавальнага калектыву. З задавальненнем прынялі гледачы выступленне студэнта з Лівана Ж. А. Амідзі. Ён праспяваў песню аб іспанскіх патрыётах-інтэрнацыяналістах. Ажыўленне выклікаў жартоўны в'етнамскі танец у выкананні студэнтаў асноўных факультэтаў універсітэта.

Агляд закончыўся ўручэннем пераможцам памятных падарункаў і сувеніраў. Прыемна адзначыць, што першае месца на конкурсе заняў танцавальны калектыў студэнтаў асноўных факультэтаў універсітэта, сярод салістаў лепшым быў таксама наш студэнт Жак Амідзі (на здымку злева).

Р. ЯНЧЫЛІК,
загадчык інтэрадцела камітэта камсамола БДУ.

Легендарная Брэсцкая крэпасць прыцягвае да сябе ўвагу шматлікіх савецкіх і замежных экскурсантаў.

Па традыцыі паездкай у Брэст заканчваецца навучальны год на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта.

На здымку: студэнты падрыхтоўчага факультэта ў час экскурсіі ў Брэсцкую крэпасць. Аб мужнасці і гераізме савецкіх воінаў расказвае абаронца гэтай бессмяротнай цытадэлі **А. А. Аршынава.**

Фота **Я. Данілава.**

3 ліпеня—дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

ЛЕТАПІС ВОГНЕННЫХ ГОД

У БІБЛІЯТЭЦЫ БДУ

Грэчка, А. А. Даклад міністра абароны СССР А. А. Грэчкі (на ўрачыстым сходзе ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў, прысвечаным 25-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне).—«Звязда», 1970, 9 мая.

Машэраў, П. М. Прамова П. М. Машэрава (на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 25-й гадавіне вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў).— «Звязда», 1969, 5 ліпеня; «Советская Белоруссия», 1969, 5 июля.

В боях за Белоруссию. (Сборник статей). Мн., «Беларусь», 1970, 374 стр. с иллюстрациями.

Освобождение Белоруссии. 1944. (Сборник воспоминаний). Под ред. А. М. Самсонова. М., «Наука», 774 стр.

Сквозь огонь и смерть. (Сборник воспоминаний о Минске периода Великой Отечественной войны). Мн., «Беларусь», 1970, 384 стр.

В едином строю. Воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии, 1941—1944. Редколлегия: П. П. Липило и др. Мн., «Беларусь», 1970. 531 стр. с илл.

Жуков, Г. К. Разгром фашистских войск в Белоруссии.—В книге: Жуков Г. К. Воспоминания и размышления. М., Изд. Агентства печати «Новости», 1969, стр. 569—600.

Рокоссовский, К. К. Здравствуй, Беларусь! (Об освобождении Белоруссии от немецко-фашистских захватчиков). —В книге: Непобедимая, легендарная. М., Изд. ДОСААФ, 1968, стр. 246—255.

Греков, В. А. Операция «Багратион». — В книге: Греков В. А. Великая Победа. Мн., «Беларусь», 1970, стр. 62—79.

Джагараў, М. Першая Мінская — на Мінск.— Мост на Свіслачы. (Урыўкі з новай кнігі ўспамінаў былога начальніка штаба Першай Мінскай партызанскай брыгады). —«Полымя», 1970, № 7, стар. 188—194; 1971, № 1, стар. 224—242.

Курган Славы. (Путеводитель). На русском и белорусском языке. Мн. «Беларусь», 1970. 12 стр.

Павлов, Я. Гроза возмездия. «Неман», 1969, № 7, стр. 3—22.

Путь к победе. (Белорусские писатели — 25-летию Великой Победы). Мн., «Беларусь», 1970, 375 стр.

Лыньков, М. Незабываемые дни. Роман. Мн., «Беларусь», 1970.

Новиков, И. Г. Руины стреляют в упор. Документальная повесть. Мн., «Беларусь», 1969. 435 стр.

Новиков, И. Г. Дороги скрестились в Минске. Документальная повесть. Мн., «Беларусь», 1966.

Шчарбатаў, Г. М. Лясны фронт. Мн., «Беларусь», 1970.

Паэтычны куток

Алесь ГАЎРОН

СКВЕР ЯНКІ КУПАЛЫ

Ні жэсту лішняга!
Ні слова!
Тут зразумела так усё.
Нібыта збітая падкова,
звініць апаўшае лісцё.
І перш чым крок зрабіць наступны,
прыйшоўшы ў гэты дзіўны кут,
прыгледзься ты,
ці не наступіш
на сонца, згубленае тут.
Тады заўважыш,
я упэўнен,
прыроды вечную мяжу...
На голлях вогненныя пеўні
дзяўбуць сцюдзёную імжу.

Леанід АНОП

АЛЕНІ

На жоўтых палянах бясшумна,
як цені,
Зоры збіваючы, ходзяць алені.
Лета шукаюць,
уздзеўшы на рогі,
Казкі лясныя,
самоту,
трывогі...
Дзе яго знойдзеш?
Падкажа мо восень?..
Ноч спіць на мяккім
абветраным верасе.
...Лісцем пажоўклым,
Мокрым і дзіўным
Падала восень
На цёплыя спіны.

Люба ТАРАСЮК

ХАТЫНСКІ БОЛЬ

Хмарнае неба над намі.
Стыне апалены вецер.
Камень ляжыць пад нагамі.
Камень цяжкі—на сэрцы...

Ранкі ўстаюць над вёскай.
Яблыняў белы кіпень...
Мёдам сваіх пялёсткаў
Пахнуць соладка ліпы.

Вечарам ціха ў лузе
Вецер пяшчотны спявае.
Светлым прызнаннем Люсю
Першая стрэча чакае...

Песні і сёння не спеты.
Сцежкі ў барах зарастаюць.
Попельным ліпы цветам
Летняй парой адцвітаюць...

О, не маўчыце, людзі!
Ўстаньце жывымі, вёсны!..
Хай больш ніколі не будзе,
Каб паміралі вёскі!..

ЛЕТНІЯ ЦЕНІ. Фотаэцюд **Д. Чаховіча.**

ПАРАДЫ ЎРАЧА

ПАГРОЗЫ ЛЕТА

Настала лета — цудоўная пара года, пара канікул, водпускаў, пара адпачынку. Але лета і асабліва восень з багаццем садавіны і гародніны небяспечны заразнымі кішэчнымі захворваннямі, такімі, як брушны тыф, дызентэрыя, страўнікавыя таксікаінфекцыі. Найбольш часта сустракаюцца дызентэрыя, страўнікавыя таксікаінфекцыі, хвароба Боткіна.

Дызентэрыя ў цяперашні час у большасці выпадкаў працякае ў лёгкай форме. Характэрныя яе прызнакі—болі ў жываце і частыя пазывы па ніз з невялікай колькасцю калу, які ўтрымлівае слізь і часам кроў. Панос звычайна працягваецца 4—5 дзён, паяўляецца агульная слабасць, знікае апетыт.

Лёгкія выпадкі захворвання як пры дызентэрыі, так і пры іншых кішэчных інфекцыях небяспечны тым, што хворыя часта не лечацца, і хвароба ў іх нярэдка пераходзіць у хранічную форму. Гэтыя людзі не ізаліруюцца і з'яўляюцца небяспечнай крыніцай інфекцыі для акружаючых.

Сур'ёзна і працягла праходзіць хвароба Боткіна. Яна выклікаецца вірусам. Хвароба можа працякаць з жаўтухай і без яе. Звычайна ў пачатку захворвання павышаецца тэмпература, знікае апетыт, паяўляецца моташнасць, часам рвота, болі ў верхняй частцы жывата.

Вірус, які выклікае захворванне, трапляе ў арганізм тым жа шляхам, што і мікробы — праз рот.

Адным з важнейшых звенняў у барацьбе з заразнымі кішэчнымі захворваннямі з'яўляецца асабістая прафілактыка. Вось асноўныя яе правілы:

Старанна сачыце за чысцінёй рук. Абавязкова трэба мыць рукі перад ядой і перад прыгатаваннем ежы.

Падтрымлівайце чысціню ў памяшканні, асабліва там, дзе ядуць, рыхтуюць страву, захоўваюць прадукты і гатовыя стравы.

Садавіну і гародніну абмывайце вадой і абдавайце кіпяткам.

Ваду з неправерaных крыніц ужывайце толькі кіпячонай. Непастэрызаванае малако і малако, купленае на рынку, неабходна кіпяціць.

Захоўвайце прадукты і гатовыя стравы так, каб да іх не мелі доступу мухі і грызуны.

Скучанасць, перамена клімату, перагранне садзейнічаюць узнікненню вострых страўнікава-кішэчных захворванняў, таму не трэба імкнуцца адпачываць летам толькі на поўдні. У Беларусі многа цудоўных месц для адпачынку, і тут можна загартавацца, набрацца сіл, атрымаць шмат цікавых уражанняў.

Прыемнага вам адпачынку! І яшчэ раз нагадваем словамі Маякоўскага:

«Грязные руки
грозят бедой.
Чтоб хворь
тебя не сломила,
Будь культурен,
перед едой
мой руки с мылом».

М. ЯЦЭВІЧ,
урач здраўпункта.

Рэктарат, партком, мясцком БДУ выказваюць глыбокае спачуванне прафесару КЕСАРАВАЙ Алене Паўлаўне з выпадку смерці маці.

Рэктарат, партком, мясцком, камітэт камсамола і прафком БДУ імя У. І. Леніна выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў дацэнту ПРЫТЫЦКАЙ Таццяне Іванаўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — заўчаснай смерці мужа ПРЫТЫЦКАГА Сяргея Осіпавіча.

Калектыў кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна выказвае глыбокае спачуванне загадчыку кафедры ПРЫТЫЦКАЙ Таццяне Іванаўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — смерці мужа.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 767. АТ 09793 **Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**